*Ірына Конан*

**РОЛЯ АСОБЫ Ў ВЫХАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГОДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ (паводле прозы У.Караткевіча)**

*«Ты прыйшоў /І гарачым словам /Рунь узняў на роднай зямлі»,* – гэтыя радкі верша У.Караткевіча «М.Багдановічу» можна з поўным правам аднесці і да асобы самога аўтара. У.Караткевіч усё сваё жыццё дбаў аб абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, узнімаючы гэтую праблему да ўзроўню агульначалавечай. Пісьменнік добра разумеў вялікае значэнне гісторыі ў справе выхавання нацыянальнай годнасці беларусаў. «Без гістарычнага рамана, гістарычнай літаратуры ўвогуле не можа абудзіцца нацыя, бо няма нацыі без пачуцця гістарызму, без спакойнага гонару за сябе і проста самапавагі, без веры ў тое, што яна ёсць яна, непераходзячая, сталая, вечная каштоўнасць вечнага чалавецтва» [2, 183].

Агульнавядома, што на ход гісторыі ў значнай ступені ўплываюць асобы, здольныя павесці за сабой народ. Пагэтаму ў многіх сваіх гістарычных раманах і аповесцях У.Караткевіч паказвае сваіх галоўных герояў іменна такімі асобамі, здольнымі паўплываць на ход гісторыі, абудзіць беларускі народ ад бяспамяцтва, выхаваць у іх пачуццё нацыянальнай годнасці.

Але як слушна заўважыў А.Верабей у сваім артыкуле «Герой прозы У.Караткевіча»: «Няпростыя і загадкавыя таксама героі твораў У.Караткевіча. Як і творчасць пісьменніка, яны ўвабралі ў сябе лірычнае і эпічнае, рамантычнае і рэалістычнае, філасофскае і публіцыстычнае, кніжнае і жыццёвае, драматычнае і гумарыстычнае ці сатырычнае, гратэскавае…» [1, 44]. І такой «няпростасцю» У.Караткевіч набліжаў сваіх герояў да рэчаіснасці, рабіў іх больш зямнымі. Бо калі б У.Караткевіч паказваў сваіх герояў ідэальнымі, пазбаўленымі ўсялякіх адмоўных чалавечых якасцей і заган, як гэта часцей за ўсё рабілі ў сваіх творах аўтары Эпохі Сярэднявечча, яны былі б недасягальнымі для простага народа. А беларускаму пісьменніку, які ставіў перад сабой задачу выхавання нацыянальнай годнасці беларусаў, важна было паказаць шлях станаўлення гэтай асобы, каб яна магла служыць узорам пераймання для іншых.

Адным з цэнтральных твораў пісьменніка-рамантыка Караткевіча з’яўляецца раман «Каласы пад сярпом тваім» (1965 г.). Галоўны герой рамана Алесь Загорскі не адразу стаў Месіяй на белым кані, здольным павесці за сабой народ. Для гэтага яму неабходна было прайсці праз «дзядзькаванне» ў Кагутоў, пашукаць ісціну ў кнігах, адчуць повязь каранёў праз дзеда Вежу…Так беларускі пісьменнік паказаў пакутлівы шлях выхавання і станаўлення сапраўднай Асобы, здольнай паўплываць на ход гісторыі, павесці за сабой народ, служыць прыкладам для пераймання.

Узгадаем не менш значны другі раман У.Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1965-1966 гг.). Згодна з вызначэннем тэарэтыка літаратуры В.Рагойшы сапраўды раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» можна назваць раманам-легендай, які заснаваны па прынцыпе калажу на многіх крыніцах (прыкмета постмадэрнізму), у.т.л. на запісе з «Хронікі…» Стрыйкоўскага, біблейскіх паданнях, паданнях з гісторыі жыцця каралевы Боны Сфорцы, жыцця Францішака Скарыны і мн. інш. Раман апавядае пра незвычайныя падзеі і пра геройскі ўчынак Юрася-Хрыста, які змог усвядоміць сваё прызначэнне на зямлі і павесці за сабой народ. Вобраз галоўнага героя «мужыцкага» Хрыста – Юрася Братчыка – цэнтральны ў рэалізацыі галоўнай ідэі твора: «І не быў ён Бог, а быў чалавек» [5, 6]. Гэты напачатку вандроўны школяр, ліцадзей, махляр і злодзей, які на працягу рамана спасцігае праўду, няўхільна ідзе да народа, становіцца «правадыром у барацьбе за права «людзьмі звацца», тым самым узвышаецца да паняцця Асобы. Нездарма ж на пачатку твора У.Караткевіч называе часцей за ўсё свайго героя Юрасём, а ў канцы – толькі боскім імем Хрыстос.

А вось якім напачатку прадстаўляе нам аўтар галоўнага героя легенды «Ладдзя Роспачы» (1964 г.) Гервасія Выліваху: «Сабою быў дзівосна гожы і пяшчотны, а паводзін самых заганных» [4, 130]. І Гервасію, як і Юрасю Братчыку, неабходна было прайсці свой нялёгкі шлях да перараджэння ў сапраўдную Асобу. Так, ладдзя Роспачы як сімвал Беларусі, спачатку перажывае жахі цемры, забыцця, смерці для радаснага адраджэння; людзі-беларусы, якія знаходзяцца ў гэтай ладдзе Роспачы таксама спачатку перажываюць жахі апраметнай і толькі праз ачышчальны смех адраджаюцца да новага жыцця. Нават у Перавозчыка-здрадніка ад жартаў і песень Выліваxі праз ачышчальныя слёзы з’явіліся з-пад плесені на вачаніцах сінія вочы. Але аднаго ачышчальнага смеху недастаткова для таго, каб пазбавіцца ад бяспамяцтва, адвечнага забыцця. І Гервасію, каб не трапіць у лапы Арахны і выратаваць іншых, неабходна было згуляць са Смерцю. Перамагчы ўдалося толькі з трэцяга разу, калі Гервасій Выліваха ўспомніў сваё дзяцінства, зразумеў, што неабходна перарадзіцца і пачаць мысліць не так, як іншыя, іншымі словамі, успомніць і вярнуцца да сваёй нацыянальнай самабытнасці.

У аповесці У.Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» (1964 г.) галоўны герой – вучоны-фалькларыст Андрэй Беларэцкі. Гэта сапраўдны інтэлігент, які займаецца збіраннем народных легенд, ужо з самага пачатку добра ўсведамляе значэнне фальклору ў адраджэнні беларускай нацыі. Але і гэты герой перажывае сваё перараджэнне праз каханне, каб стаць сапраўднай Асобай, здольнай злучыць свой лёс з лёсам народа у барацьбе за яго сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне. Нездарма ж ён у пачатку аповесці не змог разгледзець сапраўдную прыгажосць Надзеі Яноўскай, а толькі ўбачыўшы яе ў нацыянальным беларускім уборы, пачуўшы яе развažанні аб беларускім народзе, зразумеў ісцінную сутнасць гэтай беларускай дзяўчыны, змог у пэўным сэнсе перарадзіцца ў сапраўдную Асобу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аповесць «Сівая легенда» (1961 г.) можа служыць своеасаблівым пралогам да аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» (1964 г.). «Сівая легенда» апавядае пра падзеі XYII стагоддзя. Нобіль (*нобілі* - найбольш радавітая і найбольш знатная частка беларускага магнацтва, якая вядзе свой род ад нейкага слаўнага продка, і кожнае наступнае пакаленне павінна прыўмножыць славу свайго продка, нобіляў вельмі паважаў народ) Раман Ракутовіч узначаліў паўстанне мужыкоў у трыццатыя гады на Магілёўшчыне, абураны ўніямі 1569 і 1596 гадоў, а так як Уладзімір Караткевіч па сутнасці сваёй рамантык, то тут, як і ў многіх яго творах, далучыліся яшчэ і асабістыя матывы - каханне.

Падзеі ў аповесці «Сівая легенда» У.Караткевіч знарок падае праз прызму бачання наёмніка-швейцарца Канрада Цхакена, гэта як погляд збоку на Беларусь і яе народ, гэты прыём дазваляе лепш данесці да сусветнага чытача беларускае нацыянальнае пытанне, падаць падзеі, якія адбываліся на Беларусі, непрадузята. Зразумець і пранікнуцца духам беларускага народа можна, як змог гэта швейцарац Канрад.

Вобраз галоўнага героя Рамана Грынкі ў гэтым раннім творы У.Караткевіч паказвае ўжо практычна сфарміраваным. Ці не на пачатку твора мы бачым яго ўжо як Месію, прыходу якога чакалі мужыкі, на белым кані: «Конь мерна ступаў паміж целамі, і капыты звонка білі аб камень. Белы конь з залацістымі вачыма. А гэты сядзеў на ім як уліты» [4, 41]. Але і ён перажывае свае метамарфозы, каб стаць сапраўднай Асобай, праходзіць праз пакуты. І ўжо ў канцы твора мы бачым сапраўды сфарміраваную Асобу: абязручаны лепшы беларускі сын трымае у руках знявечаную маці-Радзіму, каб знайсці сілы змагацца і жыць далей.

Такім чынам, беларускі мастак у многіх сваіх творах паказаў розныя, але ў той жа час шмат у чым падобныя, пакутлівыя шляхі фарміравання сапраўднай Асобы і яе ролю ў выхаванні нацыянальнай годнасці беларусаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Верабей, А. Герой прозы Уладзіміра Караткевіча / А. Верабей // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным аспекце : навук. зб. / рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000. – 272 с.
2. Вішнявецкая, І. Біблейскія і апакрыфічныя матывы ў беларускай літаратуры XX ст. / І. Вішнявецкая // Трэцяя рэспубліканская канферэнцыя: у 5 ч. Ч. 2. – Мінск, 1997.
3. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. Т. 7. Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць; Чорны замак Альшанскі : раман / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 574 с.
4. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. Т. 2. Аповесці, апавяданні, казкі / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 511 с.
5. Караткевіч, У. Збор твораў: у 2 т. Т. 2. Хрыстос прызямліўся ў Гародні / Евангелле ад Іуды : раман. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 418 с.
6. Лявонава, Е. Плыні і постац і: З гісторыі Сусветнай літаратуры другой паловы XIX – XX ст. : дапам. для настаўнікаў / Е. Лявонава. – Мінск : Рэд. часопіса «Крыніца», 1998. – 336 с.
7. Мальдзіс, А. Уладзімір Караткевіч – пісьменнік беларускі і еўрапейскі / А. Мальдзіс // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным аспекце : навук. зб. / рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000. – 272 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ